*І.М. Ячмянёва (Магілёў)*

# ЭКСПРЭСІЎНАЯ ЛЕКСІКА Ў ТВОРАХ М.ЗАРЭЦКАГА

Творы аднаго з пачынальнікаў беларускай савецкай мастацкай літаратуры М.Зарэцкага вылучаюцца шырокім выкарыстаннем экспрэсіўнай лексікі, якая мае вялікую сілу эмацыянальнага ўздзеяння на чытача, робячы мову літаратурна-мастацкіх тэкстаў не толькі каларытнай, але і выразнай, яркай.

Сярод экспрэсіўнай лексікі, якой карыстаецца пісьменнік, выдзяляюцца дзве групы:

1. Словы, якія маюць экспрэсіўны характар незалежна ад кантэксту; у пераважнай большасці гэта лексемы прастамоўныя, хоць значэнне іх агульнавядомае: ***нечысць, ліхадзей, быдла*** (у адносінах да чалавека), ***ашалелы, раз'ятраны*** і інш.;

2. Словы, якія набываюць у кантэксце экспрэсіўна-ацэначны характар пры ўжыванні іх з пераносным значэннем: ***звер, гадзюка, цёмны, слізкі, каршуновы, свежы*** (усе прыведзеныя лексемы ў адносінах да чалавека) і інш.

Такія лексемы ў творах празаіка актуалізуюць якасна-колькасную характарыстыку рэальнага прадмета і выражаюць эмацыянальную ацэнку яго, якая надаецца ад асобы гаворачага.

<u>Эмацыянальная ацэнка</u> лічыцца намі як семантычная аснова экспрэсіўнасці. На моўным узроўні яна прадстаўлена як замацаванае ў семантыцы (у якасці семы) меркаванне аб каштоўнасці якога-небудзь аб'екта, больш канкрэтней прадстаўлена наступнымі <u>аласемамі</u>:

1. <u>Аласемы меліяратыўнай ацэнкі:</u>

<u>Адабрэнне</u> — адносіны да прадмета, звязаныя з пахвальбой.

*Мы разам з Мікітам — ён жа ў аграноміі троху* ***кумекае*** ((разбіраецца ў чым-небудзь)* "Вязьмо"). *Яна* [Таццяна] *стаяла сярод баб распаленая, вясёлая, прыгожая і ўсміхалася Зеленюку* ***цямкай*** (кемлівай, разумнай, здагадлівай) *усмешкай* (Там жа).

<u>Ласкальнасць</u> — праяўленне пяшчоты, любові, добразычлівасці, прыветлівыя адносіны да каго-небузь, чаго-небудзь.

---

*Значэнні слоў падаюцца паводле "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы пад рэдакцыяй К.Крапівы (ТСБМ).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Каб не ты, маё **дзетухна*** (ласкавы зварот да дзіцяці), *дык бы дала сабе рады іначай, але не хачу пакідаць цябе сіратой* ("Вязьмо")... *Не маю, **родненькая**. Была ў нас **хатка старэнькая**, дык, як матуля памёрла, яна брату дасталася* ("Ганулят").

Задавальненне — пачуццё радасці ад прыемных адчуванняў, думак. Зачараванне — высокая ступень радасці, задавальнення, пахвальбы. Захапленне — моцны пад'ём радасных пачуццяў як праява высокага задавальнення кім-небудзь, чым-небудзь. Даныя аласемы часцей за ўсё выступаюць як сінонімы.

*І як гэта выйшла ў яго — проста **дзівосы*** ((дзіўныя рэчы, здарэнні, цуды) "Белыя ружы"). *Жонка **маладзенькая, свежая** і **пульхненькая, як перапечка**, увайшла ў пакой з троху сарамлівай, але поўнай адчування свае жаноцкае сілы ўсмешкай і, праходзячы паўз мужа, нібы несумысля зачапіла яго сваім крутым **пышным** клубам* ("Вязьмо").

2. Аласемы пеяратыўнай ацэнкі:

Неадабрэнне, асуджэнне — пачуццё незадавальнення "прадметам", аб якім ідзе гаворка.

*І разам з гэтым найглыбейшым адчуваннем яе блізкасці ў яго* [Карызны], *як у старога падазронага **скнары*** (надзвычай скупога чалавека), *з'яўляецца ні па чым не ўзгрунтаваная апаска, што нехта можа ўкрасці, адабраць гэты мнагацэнны скарб, што ён можа згубіць яго* ("Вязьмо"). *Адна, што бліжэй да Яўмена, нешта **пляла*** (гаварыла без сэнсу, не думаючы) *пра сваю гаспадарку, пра беднасць, пра нейкае гора* ("На чыгунцы").

Пагарда — крайняя ступень непавагі, асуджэння каго-небудзь, чаго-небудзь. Агіда — вельмі непрыемнае пачуццё ў адносінах да каго-небудзь, чаго-небудзь, вельмі дрэннага, агіднага, непрыемнага. Абурэнне — высокая ступень незадаволенасці.

...*Сама такіх у сад пускаць **абібокаў*** (лежабок, гультай, лодар)... "Ная"). ***Смаркачы*** (малады, нявопытны ў справах чалавек)! *Я вам за тры дні ўвесь сельсавет у калгас уапхну. Прасіцца будуць, маліцца, каб прынялі... А не то што... **Слізнюкі*** (бязвольны, бесхарактарны, нікчэмны чалавек), *а не людзі... Цьфу!* (Вязьмо").

Такім чынам, экспрэсіўная лексіка ў творах М.Зарэцкага — вельмі прыкметны іх кампанент. Кожнае такое слова нясе значную сэнсавую нагрузку, што ўзмацняе выразнасць і ўзбагачае змест выказвання, падкрэслівае індывідуальную прымету рэаліі, удакладняе сваім адценнем агульнапрынятую семантыку і прагматыку лексікі беларускай мовы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова